1. *Багдасарьян Н.Г.* Язык культуры // Культурология. – М., 1998.
2. *Гудков Л.* Культура повседневности в новейших социологических теориях: Обзорная информация. – М.,1988.
3. *Лосев А.Ф.* Знак, символ, миф. – М., 1982.
4. *Лотман Ю.М.* Избранные статьи. – Таллин, 1992. – Т. 1.
5. *Мантатов В.В.* Образ, знак, условность. – М., 1980.
6. *Петров М.К.* Человек и культура в научно-технической революции// Вопросы философии. – 1990. – № 5.
7. *Соколов Э.В.* Культура и личность. – М., 1972.
8. *Сорокин П.А.* Человек, цивилизация, общество. – М., 1991.
9. *Суханов И.В.* Обычаи, традиции и преемственность поколений. – М., 1976.
10. *Чернов Л.Ф.* Знаковость. – СПб., 1993.

*Н.Ф.Раманоўская*

# АКВАРЭЛЬ У ПРАФЕСІЙНАЙ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКА 1920–1930-х гг.

Прафесійная мастацкая адукацыя пачатку 1920-х гг. ставіла мэтай выхаваць і падрыхтаваць да самастойнай працы агітатараў, афарміцеляў святочных шэсцяў і мітынгаў, дэкаратараў, таму вучэбна-выхаваўчы працэс спалучаўся з выкананнем утылітарна-практычных заданняў. У такіх абставінах акварэль, не прэтэндуючы на самастойнасць, выконвала падначаленую ролю: выкарыстоўвалася ў нагляднай агітацыі, друкаванай графіцы, у эскізах да плакатаў. Практычныя заданні былі звязаны са стварэннем новага тыпу сучаснай кнігі, палітычнай карыкатуры.

Рэарганізацыя ў 1923 г. дзяржаўнага мастацка-практычнага інстытута ў Беларускі дзяржаўны мастацкі тэхнікум змяніла адносіны да акварэлі. Заняткі па акварэлі з’явіліся ў навучальных планах на пачатковым этапе вывучэння дысцыплін цыкла выяўленчага мастацтва. Праграмы навучання зацвярджаліся Галоўпрафадукацыяй і Інбелкультам. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

план 1925/26 навуч. г., напрыклад, увайшлі наступныя прадметы: маляванне, жывапіс, перспектыва, скульптура, тэхналогія малявання. Хаця акварэль асобна не вылучалася, але вучні ўсіх спецыялізацый выкарыстоўвалі яе для некаторых заданняў на занятках па жывапісе і кампазіцыі.

Базавыя веды па авалоданні тэхнікай акварэлі выкладаліся на першым курсе. Амаль усе заданні па жывапісе і кампазіцыі выконваліся акварэллю або гуашшу. На занятках па кампазіцыі, напрыклад, распрацоўваліся раслінны арнамент у чатырохвугольніку ў пяць фарбаў, просты беларускі геаметрычны арнамент, абмежаваны чатырохвугольнікам, з заліўкай акварэллю ў гарманічным спалучэнні простых колераў па ўзорах беларускага арнаменту, праекты роспісу керамічнага посуду, эскізы прадметаў побыту [4]. На занятках па жывапісе некаторыя заданні прадугледжвалі выкарыстанне аднвчасова алею і акварэлі. Гэта заданні на святлацень адным колерам, выяву геаметрычнага цела, афарбаванага ў простыя колеры, нацюрморта ва ўзаемаадносінах складаных колераў [5].

Многія выкладчыкі мастацкага тэхнікума і вучылішча (В.Волкаў, М.Эндэ, М.Лебедзева, М.Міхалап, С.Юдовін) прафесійна валодалі акварэллю. У сваёй творчасці яны прытрымліваліся традыцыі рэалістычнага мастацтва. Уважлівае даследаванне аб’ектаў навакольнага свету, паслядоўнае вывучэнне натуры прасочваюцца ў акварэльных працах М.Міхалапа “Нацюрморт з лімонам” (1920), “Пейзаж. Вуліца Крывая. Віцебск” (1927), С.Юдовіна “Прадавец бублікаў” (1938–1940), якія захоўваюцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Акварэльныя эскізы да алейных карцін В.Волкава дэманструюць класічныя традыцыі акварэльнай тэхнікі, у іх спалучаюцца празрыстасць і чысціня колеру з дакладнай мадэліроўкай формы [2].

На Першай Усебеларускай выстаўцы 1925 г. настаўнікі тэхнікума М.Лебедзева, М.Эндэ, В.Волкаў экспанавалі свае акварэльныя працы. М.Эндэ выставіў пяць эцюдаў Вележа і эцюды беларускіх строяў адзення, В.Волкаў – эцюды ваколіц Вележа і Віцебска. На выстаўцы таксама экспанаваліся акварэльныя творы вучняў мастацкага тэхнікума на сюжэты і тэмы, звязаныя з краязнаўствам і этнаграфіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адзін з першых беларускіх мастакоў, для якога акварэль стала асноўным відам творчасці, Л.Лейтман выкладаў у Віцебску ў 1931–1941 гг. Для мастака віцебскі перыяд стаў важным у фарміраванні яго творчай індывідуальнасці. “Менавіта ў віцебскіх эцюдах праявіліся ўпершыню здольнасці Л.Лейтмана як тонкага лірычнага інтэрпрэтатара матываў някідкай беларускай прыроды і гарадскіх відаў, якія ў поўную моц раскрыліся ў сталыя гады мастака” [6]. Ён шмат эксперыментуе з колерам, шукае новыя тэхнічныя прыёмы, аднак многія з іх не былі даступны шырокаму колу гледачоў, іх узнёслы раскаваны настрой не адпавядаў афіцыйнай ідэалогіі дзяржавы, і мастак не мог выстаўляць гэтыя працы. Таму доўгі час імя Л.Лейтмана асацыіравалася з вытворчай тэматыкай і сухой апавядальнасцю шырокавядомых серый акварэлей “Жанчына на вытворчасці”, “Жыццё і вучоба ў Чырвонай Арміі”. Пейзаж “Вясна” – адна з нямногіх даваенных прац больш лірычнага кірунку, якая захавалася. У 1937 г. гэта праца экспанавалася ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі на выстаўцы лепшых твораў савецкіх мастакоў. А.Арава адзначае асаблівую пранікнёнасць, вастрыню ўспрымання і майстэрства каларыстычнага рашэння гэтага пейзажа [1].

Многія выхаванцы мастацкага тэхнікума (М.Тарасікаў, Я.Красоўскі, Р.Кудрэвіч і інш.) добра валодалі акварэллю і экспанавалі свае працы на ўсебеларускіх выстаўках. Для М.Тарасікава акварэль не была асноўным сродкам самавыяўлення, але ён выкарыстоўваў яе ў шматлікіх эцюдах, накідах і замалёўках. Шэраг акварэльных эцюдаў ён прывёз з паездкі ў Сярэднюю Азію (у Самарканд): “Стары Самарканд” (1930), “Кішлак залаты” (1930) [3]. У той ці іншай ступені акварэль выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці В.Волкаў, М.Эндэ, М.Лебедзева, Я.Мінін, М.Міхалап, С.Юдовін, Ф.Фогт, У.Хрусталёў. Выкладчыкі спецыяльных дысцыплін перадавалі прафесійнае майстэрства валодання акварэллю сваім вучням, якія зрабілі значны ўклад у развіццё беларускай акварэлі (С.Лі, Р.Кудрэвіч, М.Бярковіч, М.Чураба, А.Волкаў і інш.). Навучальная ўстанова, дзе засвойвалася ўменне працаваць акварэллю і існавала пераемнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкіх традыцый, становуча паўплывала на развіццё гэтага віду мастацтва.

---

1. *Арава Э.В.* Леў Мееравіч Лейтман. – Мн.: Беларусь, 1976. – С. 8.

2. *Выстаўка* твораў народнага мастака БССР прафесара В.В.Волкава, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння і 55-годдзю творчай дзейнасці: Каталог / Аўт.уст.артыкула П.Нікіфараў. – Мн.: Звязда, 1958.

3. *Выстаўка* твораў М.Л.Тарасікава, прысвечаная 35-годдзю творчай дзейнасці: Каталог / Аўт. уст. артыкула Я.Я.Красоўскі. – Мн., 1963.

4. *Праграма* па мастацтву Беларускага дзяржаўнага мастацкага тэхнікума // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.837, воп.1, арк.20, адв. 1.

5. *Праграма* па мастацтву Беларускага дзяржаўнага мастацкага тэхнікума // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.837, воп.1, арк.20, адв. 2.

6. *Рынкевіч У.* Неафіцыйны Лейтман // Мастацтва. – 2001. – № 10. – С. 38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Т.П.Раскашанская*

## САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ МАДЫФІКАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ ІДЭЙ АСВЕТНІЦТВА

У гісторыі культуры ў першыя тры чвэрці XYIIIст. усталёўваецца новая эпоха. У гэты час здзяйсняецца прарыў “ад цемры да святла розуму”. Новая эпоха ўвайшла ў гісторыю пад назвай “Асветніцтва”. Яна адзначана станаўленнем, росквітам і крызісам цэлага комплексу ідэй, грамадскіх настрояў, формаў паводзін, культурных пераваг, мэтанакіраванымі прадвяшчэннямі наступлення новага веку навуковага і духоўнага прасвятлення. Эпоха, насычаная крытычным пафасам, эпоха, якая пераацэньвала ўсё, што адносілася да чалавечага быцця з яго “светам знешнім і светам унутраным”, “білася ў цянётах страшэнных супярэчнасцей”. Характэрная рыса таго часу – працяглая аберацыя пры